УДК 796.01:316.61

***Уладзімер Паўлавіч Люкевіч***
*канд. філас. навук, дац., дац. каф. спартыўных дысцыплін і методык іх выкладання*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Uladzimier Lukievic***
*Candidate of Philosophical Sciences, Associate Professor,*
*Associate Professor of the Department of Sports Disciplines and Methods of Their Teaching*
*of Brest State A. S. Pushkin University*
e-mail: lucul@brsu.brest.by

# СПОРТ ЯК СРОДАК НАТУРАЛІЗАЦЫІ І САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ АДАПТАЦЫІ

*Сучасны свет у сацыяльных навуках апісваецца з перспектывы яго глабалізацыі альбо рэгіяналізацыі. Асновай кожнага з'яўляецца перакананне ў такіх каштоўнасцях, як дэмакратызацыя, лібералізацыя і гуманізацыя грамадскага жыцця. Сёння гэтыя тэндэнцыі дапаўняюцца паняццем міграцыі, якая з дапамогай развіцця і распаўсюджвання сродкаў камунікацыі прывяла да таго, што кожны год мільёны людзей не толькі перамяшчаюцца ў межах сваёй краіны ці суседніх дзяржаў, але і актыўна пераязджаюць на іншыя кантыненты. На першы план выходзіць матывацыя, якая вынікае з натуральнага жадання пошуку ўмоў лепшага жыцця. Мігранты адаптуюцца ў краінах свайго новага побыту самымі рознымі спосабамі: з аднаго боку, прымаюць любую прапанову працы, з другога – знаходзяць канфліктныя віды дзейнасці на мяжы права і нават пераступаюць усталяваныя законы. Сярод форм адаптацыі вызначаюцца тыя, якія маюць высокі прэстыж і атрымліваюць сацыяльнае прызнанне. Адным з найбольш удалых прыкладаў сацыяльнай адаптацыі з'яўляецца спорт.*

***Ключавыя словы:*** *спорт, натуралізацыя, сацыякультурная адаптацыя, міграцыя, глабалізацыя.*

## *Sport as a Means of Naturalization and Sociocultural Adaptation*

*Modern society in the social sciences is described from the perspective of its globalization or regionalization. The basis of each of the points of vision is the belief in such characteristics as democratization, liberalization and humanization of public life. Today these trends are complemented by the concept of migration, which, with the help of the development and spread of communication, means has led to the fact that every year millions of people move not only within the borders of their own country or neighboring states, but move to other continents. This phenomenon occurs due to a number of reasons. At the same time, motivation comes to the fore, which is inspired by the natural desire to search for a better life conditions. Migrants adapt to their new place of residence in a variety of ways. On the one hand, they accept every offer for work, on the other hand, they do criminal activities on the verge of law and even violate the established laws. Among the various forms of sociocultural adaptation those that have high prestige and receive public recognition will still stand out. Sports are one of the most successful examples in this case.*

***Key words:*** *sport, naturalization, sociocultural adaptation, migration, globalization.*

**Уводзіны**

Прафесіяналізацыя спорту, развіццё інфраструктуры, далучэнне бізнесу ў яго фінансаванне ствараюць прастору для паспяховай адаптацыі мігрантаў. Падобныя прыклады можна ўбачыць падчас шматлікіх міжнародных спартыўных спаборніцтваў, у тым ліку такіх, як Алімпійскія гульні, першынствы свету і Еўропы па футболе, матчах Champions League, – тых відовішчаў, якія збіраюць шматмільённыя аўдыторыі. Калі задацца пытаннем аналізу жыццёвых лёсаў некаторых спартсменаў, то практычна ў складзе кожнай каманды ці нацыянальнай зборнай можна выявіць так званых натуралізаваных атлетаў. Адным з найбольш выразных паказчыкаў такога становішча з'яўляецца прыклад зборнай Францыі – чэмпіёна свету па футболе 1998 г. У якасці прыкладу можна спаслацца на стартавыя пратаколы ўдзельнікаў XXXII летніх Гульняў 2020 г. (з-за пандэміі COVID-19 прайшлі годам пазней) і XXIV зімовых Гульняў 2022 г., што адбыліся ў японскім Токіа і кітайскім Пекіне адпаведна, дзе з лёгкасцю можна адшукаць прозвішчы шматлікіх натуралізаваных атлетаў.

Пытанне натуралізацыі ў спорце з'яўляецца адным з найбольш актуальных. Яно выклікае мноства спрэчак на самых розных узроўнях і засноўваецца на тым, што спартсмены, якія нарадзіліся на тэрыторыі пэўнай краіны і ад нараджэння мелі яе грамадзянства, затым у сувязі з шэрагам разнастай-

ных акалічнасцяў змянілі яго і сталі выступаць за нацыянальныя каманды іншых краін. У абсалютнай большасці прафесійнай дзейнасці такое становішча не выклікае асаблівай зацікаўленасці і застаецца па-за ўвагай шырокіх колаў публічнасці. Спорт, аднак, выглядае выключэннем.

Калі ў фінальным матчы чэмпіянату свету па футболе 1998 г. у Парыжы сустрэліся зборныя Францыі і Бразіліі, то, акрамя спартыўнай зацікаўленасці, увага балельшчыкаў была скіравана на састаў гаспадароў, у якім былі прадстаўлены ігракі, што мелі паходжанне з розных краін і вылучаліся колерам скуры, канфігурацыяй носа, формай валасоў і г. д. Здавалася, што не ўсе яны нават добра гаварылі па-французску і не ведалі належным чынам мову, але старанна спявалі дзяржаўны гімн і трымалі руку каля сэрца з гербам краіны, за якую выступалі.

Мэта артыкула заключаецца ў асэнсаванні паняцця «натуралізацыя» ў яго спартыўным увасабленні з улікам адукацыйных, маральных, міграцыйных, культурных, палітычных, філасофскіх, эканамічных і іншых фактараў. Працэсы змены прыярытэтаў сацыяльнага жыцця ў XXI ст. настолькі паскорыліся, што папярэднія канцэптуальныя стэрэатыпы раз-пораз падвяргаюцца крытычнаму аналізу. Філасофская рэфлексія ў цяперашні час выклікае хутчэй рэакцыю на падзеі і з цяжкасцю спрабуе вызначыцца з прагнастычнымі характарыстыкамі.

**Метады даследавання**

Спецыфіка работы і яе напісанне патрабавалі ад аўтара звярнуцца да такіх метадаў даследавання, як назіранне з улікам асаблівасцяў суб’ектыўнай перцэпцыі, апісанне на аснове факталагічных матэрыялаў, параўнанне матывацыйных памкненняў суб’ектаў спартыўнай дзейнасці, аналіз і адпаведная інтэрпрэтацыя навуковых, публіцыстычных і дакументальных крыніц, вывучэнне і крытычнае асэнсаванне адкрытай у доступе інтэрнэт-інфармацыі. Экстрапаляцыя выяўленых сацыяльных тэндэнцый у пэўнай меры дае магчымасць зафіксаваць механізм гэтага феномена ў іншых сферах чалавечага жыцця.

**Вынікі і абмеркаванне**

Праблема натуралізацыі атлетаў становіцца ўсё больш актуальнай у сучасным спорце. У той жа час яна неадрыўна звязана з атрыманнем адпаведнага грамадзянства, якое вызначаецца як прававая сувязь асобы з пэўнай дзяржавай. Згодна з Гаагскай канвенцыяй ад 12 красавіка 1930 г. толькі дзяржава можа надаваць грамадзянства. Кожная дзяржава можа самастойна ўстанаўліваць правілы надання грамадзянства і такім чынам вызначаць, хто з’яўляецца яе грамадзянінам. У арт. I Канвенцыі падкрэсліваецца, што кожная дзяржава самастойна вызначае ў адпаведнасці са сваім законам тых, хто можа быць яе грамадзянінам [1]. Гэта прызнаюць усе іншыя краіны ў выпадку адпаведнасці такога палажэння міжнародным пагадненням, звычаям і прынцыпам права, якія датычацца гэтай праблемы. Аднак асоба, што мае грамадзянства дзвюх і больш дзяржаў, можа разглядацца кожнай з іх у якасці свайго грамадзяніна.

Часцей за ўсё грамадзянства набываецца па нараджэнні ці па прыналежнасці да бацькоў, або яно можа быць атрымана шляхам натуралізацыі. Гэта ўключае ў сябе падачу адпаведнага запыту, і далей, як правіла, неабходна выканаць адпаведныя патрабаванні па месцы жыхарства: доказ добрых паводзін, стану здароўя, легальных сродкаў забеспячэння, наяўнасці нерухомасці, дастатковага ведання мовы і культуры краіны. Усе яны часам змякчаюцца, калі гэта адпавядае інтарэсам дзяржавы, што асабліва тычыцца спартсменаў. Дзяржаўныя органы вельмі часта ідуць насустрач просьбам спартыўных інстытутаў і адмяняюць некаторыя юрыдычныя нормы ў пытаннях атрымання грамадзянства тым атлетам, якія, на думку функцыянераў, здольны ўзмацніць нацыянальныя каманды [2].

У спорце нацыянальнасць спартсмена мае значэнне па некалькіх прычынах. Па-першае, гэта крытэрый для прадстаўлення ў зборную краіны. Па-другое, ёсць магчымасць абысці квоты, якія абмяжоўваюць колькасць легіянераў, каб збалансаваць спаборніцтвы і стымуляваць навучанне маладых атлетаў. У кожным выпадку вызначанай мэтай з’яўляецца абарона ўласных інтарэсаў як на міжнародным, так і на нацыянальным узроўні.

У сістэме рыначнай эканомікі ўплыў нацыянальнасці на спорт таксама адчувальны. Працэсы дэмакратызацыі, лібералізацыі, гуманізацыі, міграцыі, фемінізацыі ў глабалізаваным свеце не толькі стварылі адпаведныя ўмовы для фарміравання трансферных адносін з высокай мабільнасцю, але і прывялі да пэўных патрабаванняў у пытаннях натуралізацыі. Сітуацыя складваецца такім чынам, што, з аднаго боку, самі спартсмены шукаюць патэнцыяльна лепшыя варыянты для сваёй кар’еры, якая абмежавана ўзроставымі і іншымі крытэрыямі, з другога боку, нацыянальныя федэрацыі і спартыўныя клубы спрабуюць знайсці магчымасці для паляпшэння спартыўных вынікаў. У такім выпадку крытэрый нацыянальнасці можа ў вышэйшай ступені паўплываць на лёс атлета. У шэрагу выпадкаў менавіта нацыянальнасць з’яўляецца вырашальным фактарам, калі дэталізуюцца змест кантракта, сумы ганарараў і г. д. Іншымі словамі, нацыянальнасць становіцца фінансавым актывам. Дыскусіі выклікаюць такія выпадкі, калі спартсмены набываюць новае грамадзянства без якіх-небудзь папярэдніх і бясспрэчных сувязяў са сваёй новай дзяржавай. Такая натуралізацыя ў грамадскай думцы ўспрымаецца даволі неадназначна, маральны складнік пры такім падыходзе да натуралізацыі інтэрпрэтуецца прадстаўнікамі тытульнай нацыі як пагроза. Узнікае дысананс пры выпрацоўцы стратэгіі дзеяння пры складанні правілаў натуралізацыі і набыцця грамадзянства з боку нацыянальных федэрацый для клубаў і спартсменаў [2].

У дадзеным матэрыяле ўвага акцэнтуецца на трох важнейшых суб’ектах спартыўнай дзейнасці: атлетах, федэрацыях (міжнародных і нацыянальных) і клубах. Зразумела, што спартсмены выконваюць галоўную ролю: яны імкнуцца да паспяховай рэалізацыі сваёй кар’еры, якая ў любы момант можа быць прыпынена ў выніку пагаршэння стану здароўя, з-за дасягнення пэўнага ўзросту, у выніку канкурэнцыі і інш. Што да міжнародных федэрацый, то ў пытанні натуралізацыі яны праводзяць такую палітыку, каб сфармуліраваць агульныя правілы і захаваць станоўчы імідж сваёй дысцыпліны. У той жа час нацыянальныя федэрацыі праводзяць спаборніцтвы на тэрыторыі сваіх краін, забяспечваюць роўныя правы для ўдзельнікаў і таму павінны ўлічваць пэўныя абмежаванні для замежнікаў. Для прадстаўніцтва на міжнародным узроўні нацыянальныя федэрацыі час ад часу знаходзяць варыянты для натуралізацыі спартсменаў, каб палепшыць вынікі ў спаборніцтвах. Нарэшце, стратэгія клубаў заснавана на тым, што яны актыўна дзейнічаюць на трансферным рынку, таму што іх прыбыткі пераважна залежаць ад спартыўных вынікаў, на якія рэагуюць балельшчыкі. Квоты на замежных ігракоў прымушаюць кіраўніцтва клубаў шукаць шляхі ўзмацнення складу пры дапамозе натуралізацыі ўжо кваліфікаваных спартсменаў. Яшчэ адзін накірунак іх дзейнасці звязаны з тым, што спартыўныя клубы набіраюць маладых таленавітых ігракоў з розных краін, каб яны займаліся ў трэніровачных цэнтрах і потым маглі лічыцца выхаванцамі, падрыхтаванымі на мясцовым узроўні.

Доўгі час палітычны аспект спорту пераважаў над іншымі, але працэсы глабалізацыі сучаснага грамадства не абмінуў і спорт: сусветны рынак працы адкрыў свае межы для прадстаўнікоў розных краін з усіх кантынентаў. Тым не менш сістэма спорту застаецца даволі кансерватыўнай у пытаннях змены грамадзянства і выступлення спартсменаў на міжнародных спаборніцтвах пасля натуралізацыі. Наданне спартсменам грамадзянства павінна ўлічваць гарантаванае справядлівае да іх стаўленне. Акрамя таго, неабходна ўлічваць сапраўдныя сувязі паміж спартсменам і той краінай, якую ён прадстаўляе. Нарэшце, трэба імкнуцца прадухіліць «уцечку мускулаў», якая праяўляецца ў пераездзе таленавітых спартсменаў у эканамічна развітыя краіны.

Дыскусіі па пытаннях натуралізацыі спартсменаў ідуць на розных узроўнях. Актыўна распрацоўваюцца механізмы, якія б дазволілі сфарміраваць адзіныя нормы і падыходы да гэтага працэсу. Напрыклад, гэта сістэма кампенсацыі: калі спартсмен да 18 гадоў выступае за нацыянальную каманду краіны, у якой не трэніраваўся не менш за тры гады, то федэрацыя, якая яго прымае, павінна аплачваць зборы і трэніроўкі на карысць яго былой федэрацыі. Такі парадак кампенсацыі ўведзены, напрыклад, Міжнароднай федэрацыяй футболу (ФІФА) у 2001 г. Ёсць спадзяванне, што такая палітыка прынясе фінансавыя рэсурсы федэрацыям краін з менш развітай эканамічнай

структурай. Неабходна нагадаць, што калі старэйшы за 18 гадоў спартсмен згуляў хоць адну гульню за нацыянальную зборную, то ён не зможа ў далейшым выступаць за нацыянальную каманду іншай краіны.

Працэс натуралізацыі спартсменаў адбываецца згодна з заканадаўствам адпаведнай краіны на аснове міжнароднага права, але нацыянальныя спартыўныя федэрацыі вызначаюць таксама шэраг спецыфічных патрабаванняў. Напрыклад, нідэрландскі навуковец Джайсберт Унк (Gijsbert Oonk) звяртае ўвагу на тры спосабы набыцця грамадзянства. Першы – гэта прызнанне таго, што сучасныя глабальныя формы набыцця грамадзянства пры нараджэнні непазбежна ствараюць падвойныя варыянты грамадзянства. Гэта значыць, што краіны і нацыянальныя спартыўныя федэрацыі павінны прызнаць, што «падвойныя грамадзяне» могуць пажадаць змяніць спартыўнае грамадзянства. Другі спосаб: жыхары былых калоній могуць набываць грамадзянства, калі сцвярджаюць, што каланіяльныя сувязі з'яўляюцца часткай іх нацыянальнай ідэнтычнасці. Трэці спосаб датычыцца пераважна такіх краін, як ЗША і Канада, якія гістарычна прыцягвалі мігрантаў: яны выкарыстоўваюць практыку заахвочвання – спецыяльныя стыпендыі і гранты, каб запрашаць спартсменаў, якія ў перспектыве будуць іх прадстаўляць на міжнароднай арэне. Таксама можна прывесці прыклад такіх краін, як Катар і Бахрэйн, дзе большасць жыхароў з'яўляюцца мігрантамі. Тут выкарыстанне спартсменаў-мігрантаў адпавядае агульнай міграцыйнай стратэгіі: так робіцца з мэтай прадстаўніцтва краін на міжнародных спартыўных арэнах [3, с. 198]. Падвойнае грамадзянства, працягвае Дж. Унк, зліваецца пры нараджэнні ў двух выпадках: па-першае, у гендарна нейтральнай сістэме jus sanguinis (лац. *права крыві* – «грамадзянства дзіцяці залежыць ад грамадзянства яго бацькоў незалежна ад таго, на тэрыторыі якой дзяржавы яно нарадзілася і на тэрыторыі якой дзяржавы жывуць самі бацькі»), дзеці «змешанага» паходжання аўтаматычна набываюць грамадзянства абодвух бацькоў; па-другое, у выніку спалучэння jus soli (лац. *права зямлі* – «грамадзянства абумоўлена месцам нараджэння і не звязана з грамадзянствам бацькоў») і jus sanguinis. Падвойнага грамадзянства можна было б пазбегнуць толькі ў выпадку, калі ўсе дзяржавы прынялі б альбо чысты jus soli, альбо jus sanguinis ад аднаго з бацькоў. Тым не менш гендарная дыскрымінацыя ў грамадзянстве была забаронена нормамі міжнароднага і ўнутранага права, і краіны, якія прымяняюць jus soli на сваёй тэрыторыі, у асноўным надаюць грамадзянства jus krvavinis (права крыві) дзецям, народжаным іх грамадзянамі за мяжой. На аснове гэтага няма такога ўсеагульнага правіла, якое можна было б прыняць ва ўсіх краінах адразу, каб пазбегнуць некалькіх формаў грамадзянства. Іншымі словамі, дзяржавы заўсёды могуць даваць два або больш спартыўных грамадзянстваў. Нідэрландскі футбаліст Джонатан дэ Гузман (Jonathan de Guzman), напрыклад, мог гуляць за Ямайку (паходжанне па матчынай лініі), Філіпіны (паходжанне па бацькоўскай лініі), Канаду (дзе ён нарадзіўся) і Нідэрланды (дзе ён пачаў сваю кар'еру і меў права гуляць пасля натуралізацыі). Яго брат Джуліян дэ Гузман (Julian de Guzman) прадстаўляе Канаду. Такім чынам, як надзвычай таленавіты паўабаронца, Джонатан здолеў дамовіцца з галандскай і канадскай нацыянальнымі футбольнымі федэрацыямі. Яго грамадзянскі капітал (форма культурнага капіталу) быў такім, што ён мог прэтэндаваць на тое, каб выступаць за чатыры розныя краіны на міжнародным узроўні. Па той жа прычыне чатыры нацыянальныя футбольныя федэрацыі маглі змагацца за яго талент. У выніку Джонатан дэ Гузман вырашыў выступаць за зборную Нідэрландаў хутчэй за ўсё таму, што шанцы выйграць медаль чэмпіянату свету там былі найбольш высокімі [3, с. 200].

Размеркаванне па краінах футбалістаў-мігрантаў тлумачыцца шэрагам сацыяльна-палітычных і эканамічных фактараў. Доктар Рафаэль Палі (Raffaele Poli) са швейцарскага ўніверсітэта ў Неўшатэлі (University of Neuchâtel), які таксама ўзначальвае Футбольную лабараторыю Міжнароднага цэнтра па аналізе трансфернага рынку і выступленняў ігракоў, заўважае, што працягвае функцыянаваць сістэма традыцыйных міграцыйных каналаў, якая ўплывае на натуралізацыю і статус грамадзянства ў футболе. Гэта залежыць ад такіх крытэрыяў, як геаграфічная блізкасць (Германія – Усходняя Еўропа, Англія – Скандынавія, Ірландыя і іншыя часткі Вялікабрытаніі) або гістарыч-

ныя сувязі (Іспанія – Лацінская Амерыка, Італія – Лацінская Амерыка, Францыя – афрыканскія калоніі, Англія – ЗША і Аўстралія) [4, с. 499]. Зразумела, што ў сучасным глабалізаваным грамадстве могуць утварацца таксама і іншыя каналы легальных і нелегальных міграцыйных перамяшчэнняў.

У якасці яскравага прыкладу звернем увагу на склад зборнай Францыі па футболе 1998 г.: з дваццаці футбалістаў карэннымі французамі былі толькі сем (Фаб'ен Бартэз, Ларан Блан, Франк Лебёф, Дзідз'е Дэшамп, Эмануэль Пеці, Стэфан Гювар і Крыстоф Дзюгары). Што да іншых ігракоў, то яны трапілі ў Францыю рознымі шляхамі. Так, Марсэль Дэсаі нарадзіўся ў сталіцы Ганы Акры. Ва ўзросце чатырох гадоў яго ўсынавіў французскі дыпламат, выхаванне і адукацыю Дэсаі атрымаў у Францыі. Яго партнёры па абароне таксама мелі рознае паходжанне: Ліліян Цюрам паходзіў з Гвадэлупы, Біксэн Лізаразю – з краіны Баскаў, Вінсэнт Кандэла – з Іспаніі. З Гвадэлупай таксама звязаны Бернар Дзіяме і Ц'еры Анры (мама паходзіць з Марцінікі), з Арменіяй – Алан Багасян, з Аргенцінай – Давід Трэзегэ, з Сенегалам – Патрык Віера (мама паходзіць з Кабо-Вердэ), з Партугаліяй і Іспаніяй – Рабер Пірэс, з Новай Калядоніяй – Крысціян Карамбё. Асобна трэба сказаць пра Юрыя Джаркаефа. Ён нарадзіўся ў Ліёне. Яго бацька, футбаліст Жан Джаркаеф, сын калмыка і полькі, пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі эмігрыраваў з Расіі ў Францыю. Маці Юрыя армянка – Мары Аганян. Будучы ігрок сборнай Францыі выхоўваўся ў армянскай дыяспары, якая аказала на яго такі моцны ўплыў, што нават з жонкай-іспанкай ён вянчаўся ў армянскай царкве. Ён ганаровы грамадзянін Арменіі. У ліпені 2010 г. у інтэрв'ю часопісу France Football Юрый Джаркаеф паведаміў, што не выключае магчымасці аднойчы ўзначаліць зборную Арменіі па футболе. Вядома, што калі ён прыязджае ў новую для сябе краіну, то заўсёды спрабуе ўстанавіць кантакты з армянамі, якія там жывуць [5].

Яшчэ адзін знакаміты футбаліст з каманды чэмпіёнаў свету 1998 г. Зінэдзін Зідан нарадзіўся ў Марсэлі. Ён быў пятым дзіцём у сям'і алжырскіх эмігрантаў Смаіла і Малікі Зіданаў, якія пакінулі свой родны рэгіён Кабылие на поўначы краіны ў 1953 г. Напачатку Зідан вучыўся гуляць у футбол на вуліцах Ла Кастэлан у прадмесці Марсэля, дзе меўся высокі ўзровень беспрацоўя і такі ж высокі ўзровень злачыннасці.

Як можна заўважыць, прыклад футбольнай зборнай Францыі 1998 г. ілюструе пэўныя міграцыйныя тэндэнцыі XXI ст. Перш за ўсё гэта міграцыйныя рухі, якія звязаны з эканамічнымі прычынамі пошукаў лепшага жыцця. Назвы такіх экзатычных краін, як Гвадэлупа, Кабо-Вердэ, Марцініка ці Новая Каледонія, яскрава пра гэта сведчаць. Другая тэндэнцыя – гэта адносіны «метраполія – калонія» (гаворка ідзе пра былыя французскія калоніі, адкуль значна лягчэй трапіць у Еўропу). Трэцяя акалічнасць звязана з геаграфіяй – памежнымі тэрыторыямі краін-суседак, напрыклад Партугалія – Іспанія – Францыя.

Заходнееўрапейскія краіны, якія складаюць аснову Еўрапейскага саюза, як вядома, вызначаюцца высокім узроўнем і стандартамі жыцця, заснаванымі на дасягненнях сучаснага глабалізаванага спажывецкага і інфармацыйнага грамадства. Прэстыжныя рабочыя месцы займаюць карэнныя жыхары, а непрэстыжныя дастаюцца эмігрантам з бяднейшых краін. Немалую частку сацыяльнай дзейнасці ў найбольш развітых краінах займае правядзенне вольнага часу, дзе значнае месца адводзіцца спорту. Але само карэннае насельніцтва з'яўляецца хутчэй спажыўцом спартыўнага прадукту, выступае ў якасці гледача сучаснага спартыўнага аб'екта, мае магчымасць плаціць адпаведныя грашовыя сумы за білеты і разнастайныя гаджэты. Сытаму заходняму еўрапейцу няма патрэбы рызыкаваць сваім здароўем у жыццёва небяспечным прафесійным спорце. Для гэтага ёсць іншыя. Хто яны? Гэта тыя, хто ў пошуках лепшага жыцця згаджаецца на прапанову, здавалася б, лёгкага заробку. Спорт выступае ледзь не адзіным спосабам хуткага сацыяльнага росту і прызнання. Мігранты прыязджаюць працаваць туды, дзе карэннае насельніцтва не выказвае асаблівай зацікаўленасці. Перасяленцы ў першым пакаленні пагаджаюцца амаль на ўсе віды працы, каб атрымаць сродкі для жыцця, але іх дзеці ўжо пачынаюць арыентавацца і спадзявацца на якасна больш высокі статус. Праўда, навучанне ва ўніверсітэтах застаецца ў пераважнай большасці недасягальным, а вось спорт знаходзіцца ў межах дасягальнасці. У гэтым выпадку ёсць

шанц трапіць у групы падрыхтоўкі футбольных клубаў, атрымаць базавыя навыкі гульні, спартыўную форму і дадатковае харчаванне, нават нейкае фінансаванне, а галоўнае, заняць свой вольны час і тым самым шмат у чым пазбегнуць удзелу ў крымінальных групоўках, якія часта вельмі распаўсюджаны ў эмігранцкіх колах. З іншага боку, бацькі мясцовых дзяцей нярэдка выказваюць сваё незадавальненне тым, што побач з імі трэніруюцца дзеці мігрантаў. Напрыклад, Златан Ібрагімавіч успамінае пра гэта ў сваёй аўтабіяграфічнай кнізе: «Мы жылі ў Розенгардзе, у прадмесці Мальмё, дзе было поўна самалійцаў, туркаў, югаславаў, палякаў і іншых эмігрантаў плюс некалькі шведаў» [6, с. 32]. «Калі быў дзіцём, брат падарыў мне веласіпед… але аднойчы яго ўкралі… Пасля гэтага здарэння сам стаў красці веласіпеды. Адчыняў замкі. Быў у гэтай справе сапраўдным майстрам. Раз, раз, раз – і ўжо быў маім. Выкрадальнік веласіпедаў – гэта было маёй першай самасвядомасцю» [6, с. 31].

**Заключэнне**

Праблема натуралізацыі ў сучасным спорце з'яўляецца актуальнай перш за ўсё з-за таго, што сам спорт як сацыякультурны феномен шырока распаўсюджаны па ўсім свеце, ім цікавяцца сотні мільёнаў людзей, а лепшыя спартсмены ўспрымаюцца ў грамадстве як прыклады асабістага і сацыяльнага поспеху. Навіна аб трансферах і велічыні ганарараў спартыўных зорак становіцца тэмай для дыскусій у сродках масавай інфармацыі і на бытавым узроўні.

Існуе шэраг абавязковых правіл адносна механізма натуралізацыі спартсменаў і атрымання імі грамадзянства іншай краіны. Часам да гэтых правілаў прад'яўляюцца асаблівыя патрабаванні, напрыклад, распрацоўкі, прапанаваныя ФІФА, якая з'яўляецца галоўным органам кіравання самага папулярнага на свеце віду спорту. Галоўны прынцып, пазначаны ў Статуце ФІФА, дазваляе футбалісту прадстаўляць толькі адну краіну. Кожны, хто мае грамадзянства той ці іншай краіны (незалежна ад месца жыхарства), мае права гуляць у яе нацыянальнай зборнай, за выключэннем абставін, прапісаных у арт. 9 Статута: ігрок, які выступаў за адну краіну ў афіцыйных міжнародных спаборніцтвах любой катэгорыі або віду футбола (цалкам або часткова), не мае права выступаць за іншую краіну [7, с. 73].

Тым не менш крытэрый нацыянальнасці можа дазваляць футбалістам прадстаўляць больш чым адну краіну, але ў гэтым выпадку трэба, каб выконваліся наступныя ўмовы: 1) неабходна нарадзіцца на тэрыторыі адпаведнай краіны; 2) біялагічныя бацька альбо маці павінны былі нарадзіцца на тэрыторыі адпаведнай краіны; 3) бабуля альбо дзядуля павінны былі нарадзіцца на тэрыторыі адпаведнай краіны; 4) неабходна пражыць на тэрыторыі адпаведнай краіны не менш чым пяць гадоў [7, с. 74].

Атрыманне новага грамадзянства дазваляе футбалістам выступаць за нацыянальную зборную толькі тады, калі спартсмен адпавядае тром першым пералічаным вышэй крытэрыям і пражыў на тэрыторыі адпаведнай краіны не менш чым пяць гадоў пасля дасягнення васемнаццаці гадоў [7, с. 75]. Акрамя таго, у некаторых выпадках існуе магчымасць змены спартыўнага грамадзянства ў выніку ўзгаднення трансфераў паміж зборнымі [8].

У выпадку натуралізацыі футбаліст, які атрымаў новае грамадзянства без сувязі з гэтай краінай, не будзе мець права выступаць за яе нацыянальную каманду. Тут узнікае даволі спрэчная сітуацыя, якую ФІФА спрабуе вырашыць шляхам увядзення шэрага абмежаванняў, звязаных з пытаннямі месца нараджэння і часам пражывання самога футбаліста, нараджэння яго біялагічных бацькоў, а таксама бабуляў і дзядуляў. На думку функцыянераў ФІФА, такі падыход дазваляе гарантаваць, што на момант натуралізацыі ігрок будзе мець дакладныя сувязі з адпаведнай краінай.

Натуралізацыя спартсменаў з наступным наданнем ім грамадзянства той ці іншай краіны не з'яўляецца гарантыяй іх сацыякультурнай адаптацыі. У якасці прыкладаў можна прывесці спробы з далучэннем да выступленняў за нацыянальную зборную Беларусі па хакеі канадскіх ігракоў Кэвіна Лаланда, Шарля Лінгле, Джэфа Плата, якія пасля заканчэння гульняў за Беларусь пакінулі тэрыторыю краіны. Тое ж самае можна сказаць і пра нігерыйскага футбаліста Эмануэля Алісадэбе, які ў свой час прадстаўляў зборную Польшчы, а па заканчэнні кар'еры вярнуўся на радзіму. Прыклады можна пра-

цягваць і далей, аднак гісторыя гандбаліста беларускага паходжання Сяргея Рутэнкі выглядае фенаменальна: акрамя беларускага грамадзянства па нараджэнні, у 2003 г. ён атрымаў славенскае, а ў 2008 г. – іспанскае грамадзянства.

Такім чынам, неабходна падкрэсліць, што, з аднаго боку, тэндэнцыі дэмакратызацыі, лібералізацыі, гуманізацыі, міграцыі, фемінізацыі і інш. у сучасным глабалізаваным свеце паскараюць працэсы натуралізацыі і сацыякультурнай адаптацыі. З другога боку, натуралізацыя ў спорце не з'яўляецца гарантыяй сацыякультурнай адаптацыі і змена грамадзянства на сённяшні дзень яе не патрабуе.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Конвенция, регулирующая некоторые вопросы, связанные с коллизией законов о гражданстве [Электронный ресурс] : [заключена в г. Гааге 12.04.1930 г.]. – Режим доступа: http://zaki.ru/pagesnew.php?id=1498. – Дата доступа: 26.09.2023.
2. Sport and national eligibility criteria in the era of globalization [Electronic resource]. – Mode of access: https://sports-chair.essec.edu/resources/research-reports/sport-and-national-eligibility-criteria-in-the-era-of-globalization. – Date of access: 21.09.2023.
3. Oonk, G. Sport and nationality: towards thick and thin forms of citizenship / G. Oonk // National identities. – 2022. – Nr 3, vol. 24. – P. 197–215.
4. Poli, R. Understanding globalization through football: The new international division of labour, migratory channels and transnational trade circuits / R. Poli // International Review for the Sociology of Sport. – 2010. – Vol. 45 (4). – P. 491–506.
5. Youri Djorkaeff [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.peoples.ru/sport/-hockey/youri_djorkaeff/. – Date of access: 27.09.2023.
6. Ibrahimović, Z. Moja historia / Z. Ibrahimović, D. Lagercrantz, Ibra Ja. – Kraków : SINE QUANON, 2012. – 389 s.
7. FIFA Statutes (in force as from May 2022) / Fédération Internationale de Football Association. – Zurich : Fédération Internationale de Football Association, 2022. – 96 p.
8. Prawne aspekty zmiany barw narodowych [Zasób elektroniczny]. – Tryb dostępu: https://prawosportowe.pl/a/prawne-aspekty-zmiany-barw-narodowych. – Data dostępu: 21.09.2023.


## REFERENCES


1. Konviencija, riegulirujushchaja niekotoryje voprosy, sviazannyje s kollizijej zakonov o grazhdanstvie [Eliektronnyj riesurs] : [zakliuchiena v g. Gaagie 12.04.1930]. – Riezhim dostupa: http://zaki.ru/pagesnew.php?id=1498. – Data dostupa: 26.09.2023.
2. Sport and national eligibility criteria in the era of globalization [Electronic resource]. – Mode of access: https://sports-chair.essec.edu/resources/research-reports/sport-and-national-eligibility-criteria-in-the-era-of-globalization. – Date of access: 21.09.2023.
3. Oonk, G. Sport and nationality: towards thick and thin forms of citizenship / G. Oonk // National identities. – 2022. – Nr 3, vol. 24. – P. 197–215.
4. Poli, R. Understanding globalization through football: The new international division of labour, migratory channels and transnational trade circuits / R. Poli // International Review for the Sociology of Sport. – 2010. – Vol. 45 (4). – P. 491–506.
5. Youri Djorkaeff [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.peoples.ru/sport/-hockey/youri_djorkaeff/. – Date of access: 27.09.2023.
6. Ibrahimović, Z. Moja historia / Z. Ibrahimović, D. Lagercrantz, Ibra Ja. – Kraków : SINE QUANON, 2012. – 389 s.
7. FIFA Statutes (in force as from May 2022) / Fédération Internationale de Football Association. – Zurich : Fédération Internationale de Football Association, 2022. – 96 p.
8. Prawne aspekty zmiany barw narodowych [Zasób elektroniczny]. – Tryb dostępu: https://prawosportowe.pl/a/prawne-aspekty-zmiany-barw-narodowych. – Data dostępu: 21.09.2023.


*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 06.10.2023*